

# БЕЛАРУСЬ МЫ Ў АДКАЗЕ ЗА ПРАЎДУ

**«Круглы стол» «Беларусь і Расія: мы ў адказе за праўду аб вайне» напярэдадні 75-й гадавіны пачатку Вялікай Айчыннай адбыўся ў канферэнц-зале «Звязды». Якім чынам супрацьстаяць фальсіфікацыям і як агульнымі намаганнямі захаваць памяць аб падзеях больш чым 70-гадовай, разважалі дырэктар Дзяржаўнага музея ваеннай гісторыі Рэспублікі Беларусь Сяргей АЗАРОНАК, сустаршыня агульнарасійскага грамадскага грамадзянска-патрыятычнага руху «Бессмяротны полк Расіі» Мікалай ЗЯМЦОЎ, кіраўнік выканкама агульнарасійскага грамадскага грамадзянска-патрыятычнага руху «Бессмяротны полк Расіі» Алена КАЛГІНА, вядучы спецыяліст упраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Беларусі Аляксандр ЛУГІН, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», доктар гістарычных навук, аўтар кніг на ваенную тэматыку Анатоль ШАРКОЎ.**

## Галоўнае — казаць праўду

***— Нівеліраванне памяці пра Вялікую Айчынную вайну паступова становіцца нормай для сусветнай супольнасці. Як змагацца з фальсіфікацыямі гісторыі?***



Мікалай ЗЯМЦОЎ.

**Мікалай ЗЯМЦОЎ:** — Тры гады таму я пахаваў бацьку, які з'яўляўся носьбітам ведаў пра вайну. Ён быў ветэранам, вызваляў Маскву, прарываў блакаду Ленінграда, знішчыў нямецкую калону, прамой наводкай расстраляўшы яе з рэактыўнага мінамёта «Кацюша». А пэўныя людзі, разумныя, з добрай адукацыяй, абсалютна цынічна аспрэчваюць Перамогу, якую савецкі народ атрымаў за чатыры найцяжэйшыя гады, пранёсшы на яе алтар вялікія ахвяры. Гэта была самая кровапралітная вайна, і подзвіг тады быў нормай.



Анатоль ШАРКОЎ.

**Анатоль ШАРКОЎ:** — Мой бацька таксама ваяваў, быў адным з арганізатараў партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі. Я вырас на яго аповедах. Тады ўсе беларусы, якія засталіся з мужчынскага насельніцтва, былі ўдзельнікамі вайны. І ў кожнага была свая праўда. І пра тую Перамогу, што нехта заваяваў яе акрамя іх, нават размовы не магло быць. Але час ідзе. І подзвіг савецкага народа не тое што пачынаюць забываць, а збіваюць са свядомасці тых, хто памятае. Ажно да таго дайшло, што ўраўноўваюць Сталіна з Гітлерам, Савецкі Саюз з нацысцкай Германіяй. І нават віну ў развязванні вайны некаторыя спрабуюць павесіць ледзь не на Савецкі Саюз. Камусьці выгадна так падаваць гісторыю, прыніжаць нашу ролю ў Перамозе над фашызмам.



Сяргей АЗАРОНАК.

**Сяргей АЗАРОНАК:** — У свой час у складзе дэлегацыі я прысутнічаў на адкрыцці Музея саюзнікаў у Берліне. І мы былі абураны лагатыпам гэтай установы. Звярніце ўвагу (Сяргей Іванавіч паказвае фотаздымак лагатыпа. — **Аўт.**), тут ёсць сцягі ўсіх пераможцаў, акрамя Савецкага Саюза. Заўважыўшы наша абурэнне, нам патлумачылі, што такой краіны ўжо не існуе. Вось вам відавочны прыклад нівеліравання Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.



Аляксандр ЛУГІН.

**Аляксандр ЛУГІН:** — Нівеліраванне памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны з боку заходняй прапаганды — аб'ектыўная рэальнасць. І нам, відома, трэба знаходзіць новыя формы і метады барацьбы з гэтай з'явай. Каб змагацца з фальсіфікацыямі гісторыі, у першую чаргу, трэба ісці ад сям'і. Калі ў кожнай сям'і дзеці і ўнукі будуць ведаць, хто ў гады вайны быў іх бацька і дзед, як яны ваявалі, якія ўзнагароды мелі, то нам няма чаго баяцца. На шчасце, усю інфармацыю сёння можна знайсці ў інтэрнэце.



Алена КАЛГІНА.

**Алена КАЛГІНА:** — Заўсёды прыемна, калі старэйшае пакаленне асвятляе любыя пытанні праз сваю асабістую гісторыю. Нават большасць з людзей, якія ўдзельнічалі у «круглым стале», пачынаюць аповед пра сваіх продкаў. І лічаць важным расказаць усім навакольным, што і ў іх сям'і былі такія людзі, якія ўнеслі свой уклад у Вялікую Перамогу.

**Анатоль Шаркоў:** — Усе мы сочым за сродкамі масавай інфармацыі, бываем за мяжой і бачым, што адносіны да нашых людзей, якія вызвалілі Еўропу, перамаглі нацызм і заваявалі Перамогу ў гэтай вайне, мяняюцца. Помню, калі яшчэ маленькім удалося пабываць у краінах сацлагера, там былі зусім іншыя размовы. Пасля вядомых падзей усё вельмі памянялася. Ужо аплёўваюць тое, што зрабілі, заслужылі салдаты Чырвонай Арміі — уласна кажучы, нашы бацькі і дзяды.

**Што такое Перамога? Гэта ж не матэрыяльная каштоўнасць. Гэта выснова розуму. Дастаткова памяняць у свядомасці гэтае паняцце, дэвальваваць, змяніць яго — і мы ўжо не спадчыннікі Перамогі.**

**Мікалай ЗЯМЦОЎ:** — Перамога бясспрэчна з'яўляецца здабыткам нашых народаў. Але ўсё гэта цынічна выкарыстоўваецца для таго, каб гэтая рэпутацыя і гэтыя факты служылі на карысць іншым нацыям. Нічым іншым, як крадзяжом, я гэта назваць не магу. І не магу зразумець, як можна ўзяць фотаздымак, на якім адлюстраваны Сталін, Чэрчыль і Рузвельт, і проста адрэзаць ад яго нашага Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, казаць, што яны вызвалілі Еўропу і абсалютна спакойна выхоўваць на гэтым падрастаючае пакаленне. Вось і вырасла тое пакаленне людзей, якое мае абсалютна перавернутае ўяўленне аб гісторыі.

**Сяргей АЗАРОНАК:** — Калі скончылася «халодная вайна», усе народы ўздыхнулі з палёгкай. Здавалася, нарэшце ўсе погляды людзей будуць накіраваны да міру. Але калі разабрацца з вышыні сённяшняга часу, «халодная вайна» скончылася, але яе нябачную частку мы можам назіраць сёння ў выглядзе інфармацыйнай вайны. Асіметрычная вайна ў сферы сэнсаў, яна ўжо прыносіць свае перамогі, якія, на жаль, не на нашым баку. Развал Савецкага Саюза, распад Варшаўскага дагавора, выгнанне вызваліцеляў з тэрыторыі краін Усходняй Еўропы — гэта перамогі нашых інфармацыйных праціўнікаў у інфармацыйнай вайне. Зараз яна пераходзіць у найбольш вострую фазу, і нам трэба быць гатовымі да гэтага.

**Аляксандр ЛУГІН:** — Таму ўвесь час трэба казаць праўду. Асабліва якой крывёй і якімі стратамі дасталася нам Перамога. А то пачынаеш чуць такога роду выказванні: не так шмат насельніцтва і забілі, фашысты не лютавалі, а цукеркі давалі... Мы, калі праводзім пошукавыя работы на тэрыторыі Беларусі, дагэтуль сутыкаемся з жудаснымі фактамі. Асабліва ўражваюць месцы пахавання ваеннапалонных. Напрыклад, цяпер мы вядзём раскопкі ў Барысаве, на месцы 382-га лагера. Паглядзіце самі (паказвае фотаздымак, зроблены падчас раскопак. — **Аўт.**): трупы салдат складзены штабялямі, магіла паўтара на два метры, а там — па 18—20 чалавек. Вось аргумент тым, хто апраўдвае фашысцкіх злачынцаў. А ўсяго на тэрыторыі Беларусі было 260 лагераў для ваеннапалонных і грамадзянскага насельніцтва. Пяты год мы капаем на месцы лагера ў Гродне і, напэўна, яшчэ эксгумавалі не апошняга салдата. На сённяшні дзень знойдзены астанкі больш як чатырох тысяч савецкіх салдат. Вось пра што трэба казаць, вось што трэба паказваць.

**Анатоль ШАРКОЎ:** — Напэўна, нам трэба такія фотаздымкі больш публікаваць і прадстаўляць у сродках масавай інфармацыі. І калі казаць пра пэўны гістарычны факт, то пацвярджаць свае словы дакументальна. Ужо столькі дакументаў прайшло праз мае рукі, але часам чытаеш і дзіву даешся: няўжо людзі маглі здзекавацца так з людзей? І самае жудаснае, што ў асноўным са сваіх суайчыннікаў.

## Асноўны рэсурс — нашчадкі пераможцаў

***— Як захаваць памяць пра падзеі больш як 70-гадовай даўніны агульнымі намаганнямі?***

**Мікалай ЗЯМЦОЎ:** — Прыйшоў час, калі трэба ўкараняць тыя факты, якія ёсць у нас, у тыя тэхналогіі, якія ўспрымаюцца як маладзёжнай аўдыторыяй, так і сусветнай грамадскасцю ў цэлым. У першую чаргу, гэта кінематаграфія, інтэрнэт і ўсемагчымыя публікацыі, у тым ліку кнігі. Я думаю, што дарэчы на дзяржаўным узроўні Беларусі і Расіі стварыць нейкае напаўненне нашай Саюзнай дзяржавы, якое магло б каардынаваць народы нашых дзвюх краін. Мы бралі б гэтыя неверагодныя гістарычныя факты і кансалідавана даводзілі б іх да аўдыторыі ў зручнай для яе форме. У пэўнай ступені мы гэтымі тэхналогіямі авалодалі. Нам засталося толькі аб'яднацца.

**Беларуска-расійскія пляцоўкі маглі б стаць цэнтрам збору той часткі Еўропы, якая не хоча быць апранута ў шынель неафашызму.**

**Анатоль ШАРКОЎ:** — Пастаянна ідзе знішчэнне памяці. Узяць хоць бы такія носьбіты памяці, як помнік або воінскае пахаванне. У Еўропе іх захавалася нямала. Але мы бачым, што адбываецца ў той жа Польшчы, дзе знеслі помнік Чарняхоўскаму. А ён, між іншым, разам са сваім войскам вызваляў гэтую краіну. Вядома, лепш прыбраць, а потым можна казаць, што хочаш. Помнікі пераносяць, прыдумаўшы зручную прычыну, маўляў, сабраць у адно месца, магчыма, каб потым у адным месцы і знішчыць. Я разумею, ёсць сітуацыі, калі астанкі салдат неабходна эксгумаваць, але ў такім выпадку перапахаваць іх трэба ў годным месцы. І калі мы гэтыя носьбіты памяці пусцім на самацёк, калі не будзем пра іх казаць, ка-

